*ЛІТШКОЛА*

# *ПРАДЧУВАННЕ ПЕЙЗАЖУ*

**14 сакавіка 2023 года (гістарычны момант) у створанай Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі Гродзенскай грамадскай літаратурнай школе перайшлі да вывучэння формы мастацкага твора. Стартавым пунктам на гэтым працяглым шляху вырашана было зрабіць тэму «Мастацкія дэталі. Пейзаж».**

Аматары літаратурнай творчасці рознага ўзросту, якія прыйшлі на сакавіцкі занятак, традыцыйна пачалі сваю калектыўную працу з тэарэтычнага блока, у якім спачатку пазнаёміліся (альбо асвяжылі ў памяці свае веды) з паняццем «мастацкая дэталь», яе відамі і роляй у творчым працэсе. Затым удзельнікі грамадска-адукацыйнага праекта ГрАА СПБ пачалі даследванне аднаго з відаў мастацкай дэталі – пейзажу.

Што і казаць, усе пастараліся ад душы. Дзве з паловай гадзіны праляцелі вельмі хутка. Але гэта быў час вельмі важны для кожнага ўдзельніка нашага літаратурнага жыцця, паколькі дапамог зрабіць мноства важных адкрыццяў. Перш за ўсё ў галіне міжасобасных узаемаадносін.

Што тычыцца творчых рашэнняў – пра гэта варта сказаць асобна. Пейзажы ў напісаных экспромтам мастацкіх тэкстах атрымаліся не шаблонныя, а наадварот вельмі самабытныя, разнастайныя па сваіх уласцівасцях і характарыстыках. Сярод іншых вынікаў: па-першае, мы раскрылі сутнасць літаратурнага пейзажу ў псіхалагічным і філасофскім планах. Па-другое разабралі паняцце пейзажу на структурныя элементы. Па-трэцяе, на прыкладах з уласнай практыкі вызначылі функцыі літаратурнага пейзажу: сацыяльную, алегарычную (сімвалічную), кампазіцыйную і паэтычную (эстэтычную). У ходзе практычнага блока ўдзельнікамі заняткаў былі напісаны творы мастацкай літаратуры ў жанрах апавядання, эсэ і класічнага верша. Да ўсеагульнай радасці, тэксты атрымаліся годнымі. Усвядомленая, падмацаваная новымі кампетэнцыямі творчасць прынесла людзям сапраўдную радасць, папоўніла іх вопыт, а дыскусія ў нязмушанай сяброўскай манеры згуртавала наш круг аднадумцаў. Істотны недахоп мерапрыемства – вельмі нізкі інтарэс да праекта з боку членаў СПБ (удзельнічалі толькі два чалавекі, і гэта не робіць гонару нашай пісьменніцкай арганізацыі). Наяўнасць памылак, вялікая колькасць рознага роду праблемных месцаў у асобных тэкстах і выдадзеных кнігах – сведчанні недахопу ведаў, нізкага ўзроўню кампетэнцый і культуры літаратурнай творчасці. Варта адзначыць, што кожная сустрэча ў нашай літшколе дапамагае атрымаць каштоўныя веды не толькі па зададзенай тэме.

Пейзаж як мастацкая дэталь разглядаўся ўсебакова – на ўзроўні аўтарскай задумы і з пазіцыі ўспрымання. Не менш цікавымі і карыснымі абяцаюць стаць красавіцкі і майскі заняткі. Калі ласка, сачыце за анонсамі.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На здымках:** у створанай Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі Гродзенскай грамадскай літаратурнай школе (заснавана ў маі 2016 года) аматары прыгожага пісьменства рознага ўзросту правялі заняткі на тэму «Мастацкія дэталі. Пейзаж». Офіс СПБ у Гродне, 14 сакавіка 2023 года.





Падчас практычнага блоку заняткаў.

Член СПБ, беларуская паэтэса, публіцыст Тамара Мазур






**Аматар літаратуры, аўтар адзінаццаці кніг для дзяцей Вольга Дзіканава і маладая паэтэса з Гродна Анастасія Рымашэўская**








**Празаік Кацярына Калік і паэтэса Таццяна Лугавая (гарлітаб’яднанне «Надзея»)**

**Паэтэсы Людміла Мілоста («Надзея») і Ірына Полудзень. Віншуем Ірыну Мікалаеўну Полудзень з публікацыяй ў Гродзенскай рэгіянальнай газеце «Перспектива»!**






**Уласны твор чытае аматар літаратуры, паэтэса Алена Шаламіцкая**



**Аўтарскі тэкст з пейзажам ад мастачкі, празаіка Вольгі Клімянковай**




**Культуралагічныя дыскусіі – наша традыцыя**



**Дэбютант Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы, аматар літаратуры, паэт Аляксандр Ганчароў**



**Усе разам.** *Фота прэс-службы СПБ-Гродна*